# АДНАЎЛЕННЕ НАРОДНАЙ ГАСПАДАРКІ БЕЛАРУСІ Ў 1943–1945 гг.: ПРАБЛЕМЫ ГІСТАРЫЯГРАФІІ

***Здановіч У.В.***
УА «Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С. Пушкіна», г. Брэст

Аднаўленне эканомікі, культуры, адукацыі Беларусі пачалося ўжо ў часы Вялікай Айчыннай вайны. Супярэчлівасць аднаўленчых працэсаў, комплексны характар задач, якія стаяць перад даследчыкамі, робяць даволі складаным працэс выпрацоўкі абагульняючых ацэнак. А гэта, ў сваю чаргу абумоўлівае неабходнасць працягу гістарыяграфічнай працы. Гістарыяграфічны аналіз у сукупнасці з прыцягненнем новых крыніц, іх усебаковай інтэрпрэтацыі дазваляе дасягнуць значных вынікаў у найбольш перспектыўных накірунках навуковага пошуку.

Першыя ацэнкі асаблівасцей аднаўлення на вызваленых тэрыторыях былі сфармуляваны ў дакладах і артыкулах вядомых партыйных і дзяржаўных дзеячаў, кіраўнікоў разнастайных ведамстваў і ўстаноў. У пэўным сэнсе дадзеныя працы не з'яўляліся навуковымі і мелі ў асноўным публіцыстычны характар [1, 2, 3, 4].

На працягу першага пасляваеннага дзесяцігоддзя гістарычная навука зрабіла толькі першыя крокі ў навуковае асвятленне пытанняў аднаўлення народнай гаспадаркі. Разглядаемай праблеме была прысвечана манаграфія М.А. Вазнясенскага "Военная экономика СССР в период Отечественной войны", якая аказала значны ўплыў на ўсю савецкую гістарыяграфію. Асобная глава кнігі "Восстановление хозяйства в ходе войны" стала канцэптуальнай асновай большасці наступных прац аб аднаўленні эканомікі ў ваенныя гады [5]. Аўтар ўвёў у навуковы зварот новыя дадзеныя, паказаў уклад вызваленых раёнаў, у тым ліку і Беларусі, у агульнасаюзную эканоміку.

Спецыяльная глава аб аднаўленні народнай гаспадаркі і культуры рэспублікі без выдзялення асобнага перыяду 1943–1945 гг. утрымліваецца ў працы беларускіх гісторыкаў І.С. Краўчанкі і А.І. Залескага [6].

Так, у працы "Очерки истории Коммунистической партии Белоруссии" дадзеная праблема раскрываецца ў 5-м параграфе 4-й главы "Деятельность Компартии Белоруссии по организации восстановительных работ в республике после изгнания гитлеровских оккупантов. Победоносное значение Великой Отечественной войны" [7, с. 387–402].

Некаторыя сюжэты акрэсленай тэмы раскрываюцца ў брашурах і артыкулах А.Я. Пейсаховіча, І.Я. Марчанкі, Л.А. Міхайлоўскага [8, 9, 10]. Аднак у цэлым стан навуковай распрацоўкі праблем аднаўлення народнай гаспадаркі не адпавядаў узроўню вывучэння Вялікай Айчыннай вайны.

У 1970-х–1980-х гг. актывізаваліся даследаванні па гісторыі сялянства, рабочага класа і інтэлігенцыі, у якіх раскрываюцца асобныя бакі працэсу аднаўлення вызваленай тэрыторыі Беларусі. Неабходна адзначыць, што па аб'ектыўных прычынах галіновае вывучэнне праблемы атрымала найбольшае развіццё. У пэўнай ступені гэта было выклікана тым, што дадзеныя аб'екты адносна лёгка падвяргаліся навуковаму даследаванню і адпавядалі агульнай канцэпцыі адлюстравання пасляваеннай гістарыяграфіі. Прыкладам галіновага падыходу з'яўляюцца абагульняльныя шматтомныя выданні па гісторыі рабочага класа, калгаснага сялянства, а таксама манаграфіі У.Я. Марчанкі [11] і А.П. Белязо [12]. Не адвяргаючы абгрунтаванасці такога падыходу, падкрэслім, што яго дамінаванне прывяло да таго, што абагульняльныя даследаванні па тэме ва ўсёй сукупнасці аднаўленчых працэсаў з'яўляліся рэдкасцю. Аналагічны падыход уласцівы большасці падрыхтаваных у азначаны перыяд артыкулаў [13, 14].

Аўтары толькі некаторых манаграфічных работ разглядалі аднаўленне як адзіны многаўзроўневы працэс, як цэласную з'яву, якая развівалася пад уздзеяннем дзяржаўнай палітыкі і ідэалогіі. Менавіта так пададзены матэрыял, прысвечаны аднаўленчым працэсам у Беларусі ў другім раздзеле манаграфіі Г.І. Аляхновіча [15].

Аднак у цэлым да 1970-х гг. стан навуковай распрацоўкі праблем аднаўлення народнай гаспадаркі не адпавядаў узроўню вывучэння Вялікай Айчыннай вайны. У 1970–1980-я гг. было выдадзена некалькі манаграфічных даследаванняў, якія былі спецыяльна прысвечаны праблематыцы адраджэння вызваленых рэгіёнаў. Найбольш грунтоўна праблема адраджэння народнай гаспадаркі ў 1943–1945 гг. раскрыта ў апублікаваных працах і доктарскай дысертацыі Г.П. Купрэевай [16, 17].

Аналіз гістарычнай літаратуры паказвае, што ў савецкія часы ў вывучэнні аднаўленчых працэсаў на тэрыторыі Беларусі былі дасягнуты значныя поспехі. Асаблівая ўвага надавалася ролі Камуністычнай партыі ў рашэнні пытанняў аднаўлення. Шэраг прац прысвечаны развіццю асобных галін эканомікі, транспарту, сельскай гаспадаркі, культуры, адукацыі. Акрамя таго, ў даследаваннях паказана роля розных сацыяльных груп у адраджэнні Беларусі. Акцэнтуацыя ўвагі на паказе праяў і пераваг сацыялістычнай сістэмы, ухіл у бок падкрэслівання поспехаў садзейнічаў таму, што глыбокі аналіз разглядаемых пытанняў падмяняўся іх апісальнасцю. Многія сюжэты, наогул, засталіся па-за ўвагай даследчыкаў.

Працэсы, якія пачаліся пасля распаду СССР, прад'явілі новыя патрабаванні да гістарычнай навукі. Аслабленне ідэалагічнай цэнзуры стварыла большую свабоду для навуковага аналізу маладаследаваных ці зусім не даследаваных падзей Вялікай Айчыннай вайны [18, 19]. Разам з паказам станоўчага вопыту, працоўнага гераізму беларускага народа на вызваленай ад захопнікаў тэрыторыі ў працах сучасных айчынных гісторыкаў знайшлі адлюстраванне такія аспекты, як недахопы і пралікі ў правядзенні аднаўленчых мерапрыемстваў, жорсткая кадравая палітыка, асабліва ў заходніх абласцях рэспублікі, ідэалагічны ціск на розныя катэгорыі насельніцтва, рэпрэсіўныя меры ў дачыненні асоб, западозраных у прыналежнасці да калабарантаў, прыстасаванне насельніцтва да новых палітычных рэалій. Менавіта з такіх пазіцый, з улікам дасягненняў сучаснай гістарычнай навукі азначаныя сюжэты разгледжаны ў манаграфіі і артыкулах У.І. Кузьменкі [20, 21], калектыўным выданні "Беларусь в годы Великой Отечественной войны. 1941–1945 гг. ".

У сувязі з усё большымі магчымасцямі доступу да раней закрытых архіўных матэрыялаў, ростам цікавасці навукоўцаў да лёсу рэпрэсаваных павялічылася ўвага гісторыкаў да праблемы прымусовай працы, якая раней не вывучалася ў савецкай і айчыннай гістарыяграфіі. Асабліва актыўна дадзеная тэма стала распрацоўвацца расійскімі даследчыкамі. У.А. Пронька, У.М. Зямскоў, М.Б. Смірноў, Ц.М. Цімошын, У.П. Беліхін і іншыя паказваюць, што ў розных галінах эканомікі ў прымусовых працах удзельнічалі прадстаўнікі розных катэгорый рэпрэсаваных: асуджаныя за супрацоўніцтва з ворагам, за крымінальныя злачынствы, рэпатрыянты, у тым ліку былыя савецкія ваеннапалонныя, дэпартаванае насельніцтва, калгаснікі, якія сталі ахвярамі кампаніі за ўмацаванне калгасаў, спецыялісты, інжынеры, канструктары, дзеячы культуры і г.д. Па розных падліках расійскіх навукоўцаў у сістэме ГУЛАГа ў пасляваенныя гады ўтрымлівалася ад 8 да 15 млн. чалавек [23, с. 250].

У сучаснай айчыннай гістарыяграфіі азначаная праблема не знайшла шырокага асвятлення. Асобныя яе сюжэты раскрыты ў працах У.І. Кузменкі, М.У. Токарава [24, 25].

Як вядома, працэс аднаўлення, які пачаўся адразу пасля вызвалення першых населеных пунктаў ад акупантаў, праходзіў у непамерна складаных умовах. Не хапала будаўнічых матэрыялаў, абсталявання, сыравіны, паліва. Сур'ёзнай праблемай з'яўляўся недахоп рабочых, асабліва спецыялістаў. Для выпраўлення сітуацыі, а таксама ў якасці

кампенсацыі матэрыяльных страт, нанесеных захопнікамі, было прынята рашэнне аб выкарыстанні ваеннапалонных, якія знаходзіліся на тэрыторыі Беларусі. Разнастайныя аспекты праблемы, практычна недаследаванай у савецкія часы, сталі тэмай даследавання А.В. Шаркова [26, 27]. Па падліках беларускага гісторыка, са спасылкай на архіўныя і апублікаваныя крыніцы, на пачатак 1946 г. УПВІ мела ў сваім падпарадкаванні 11 лагераў, 8 спецшпіталяў і батальёнаў інтэрніраваных. У іх утрымлівалася звыш 88 тыс. ваеннапалонных і інтэрніраваных. Акрамя таго, ў асобных рабочых батальёнах сістэмы Міністэрства Узброеных Сіл СССР, якія дыслацыраваліся на тэрыторыі Беларусі, утрымлівалася 14019 ваеннапалонных. Усяго на тэрыторыі Беларусі ў 1946 г. знаходзілася каля 103 тыс. ваеннапалонных і інтэрніраваных [27, с. 39–40]. Шырокая крыніцазнаўчая база, новыя метадалагічныя падыходы, дазволілі даследчыку доказна сцвярджаць, што ваеннапалонныя і інтэрніраваныя, якія працавалі на вядучых будоўлях рэспублікі, унеслі значны ўклад у аднаўленне эканомікі Беларусі, у выкананне планаў па дасягненню даваеннага ўзроўню вытворчасці прамысловай прадукцыі.

Некаторыя аспекты ўдзелу замежных ваеннапалонных у аднаўленні разбуранай гаспадаркі Беларусі разглядаецца ў артыкулах В.А. Мішураўскай, А.Л. Самовіча [28, 29].

Аднаўленне на вызваленых ад акупантаў тэрыторыях Беларусі адбывалася ў складаных умовах. Асабліва напружанай і нестабільнай грамадска-палітычная сітуацыя была ў заходніх абласцях рэспублікі. Тут дзейнічала разгалінаванае польскае, украінскае, літоўскае антысавецкае падполле, прадстаўнікі якога прэтэндавалі на заходнія беларускія землі і ставілі перад сабой мэту знішчэння савецкай улады. Найбольш арганізаванай з'яўлялася Армія Краёва (АК). Адносіны мясцовага насельніцтва да антысавецкіх ваенізіраваных фарміраванняў былі неадназначнымі. У некаторых рэгіёнах Заходняй Беларусі сяляне дапамагалі атрадам АК і Украінскай Паўстанскай Арміі (УПА). Разам з тым дакументальныя крыніцы фіксуюць і дапамогу мясцовага насельніцтва органам НКУС у барацьбе з імі. Неадназначнымі былі таксама ўзаемаадносіны паміж жыхарамі вызваленых тэрыторый. Побач з узаемадапамогай існаваў і недавер да аднавяскоўцаў, якія вярнуліся з эвакуацыі ці з прымусовых работ у Заходняй Еўропе. Розныя настроі былі і ў рэпатрыянтаў. Адзначаныя асаблівасці сітуацыі, якая склалася на вызваленых тэрыторыях, у першую чаргу Заходняй Беларусі, знайшлі адлюстраванне ў працах У.А. Валахановіча, Н.А. Рыбак, В.А. Белазаровіча, Ю.У. Чарняка, С.У. Жумара, В.І. Ермаловіча, С.А. Сіткевіча, А.В. Раманько [30, 31, 32, 33, 34, 35, 36].

Не менш складанай на вызваленых тэрыторыях з'яўлялася і канфесійная сітуацыя. Актывізацыя рэлігійнага жыцця, выклікала ўзмацненне дзяржаўнага кантролю за дзейнасцю розных канфесій, што прыводзіла да канфліктаў паміж вернікамі, прадстаўнікамі савецкай улады. Некаторыя аспекты рэлігійнага жыцця на вызваленых тэрыторыях паказаны ў працах С.У. Сілавай і Э.С. Ярмусіка [37, 38].

Такім чынам, за пасляваенны перыяд навукоўцамі асветлены шырокі і мнагапланавы спектр пытанняў, звязаных з аднаўленчай праблематыкай. Аб'ектамі гістарычнага даследавання сталі дзейнасць дзяржаўных органаў па ажыццяўленню праграмы аднаўлення, працоўны гераізм, цяжкасці і дасягненні ў вырашэнні пастаўленых задач, прымусовая праца рэпрэсаваных савецкіх грамадзян, а таксама ваеннапалонных і інтэрніраваных. На сучасны момант склаліся неабходныя ўмовы для стварэння цэласнай канцэпцыі аднаўлення народнай гаспадаркі, устаноў адукацыі і культуры.

## Список цитированных источников и литературы

1. О неотложных мерах по восстановлению хозяйства в районах, освобожденных от немецкой оккупации: постановление СНК СССР и ЦК ВКП(б), 22 августа 1943 г. // КПСС в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов – 7-е изд. – М.: Политиздат, 1954. – Ч. 3. – С. 437–474.

2. Аб задачах партыйных арганізацый КП(б) Беларусі па аднаўленню народнай гаспадаркі і ліквідацыі вынікаў нямецкай акупацыі: пастанова VI Пленума ЦК КП(б) Беларусі па дакладу сакратара ЦК КП(б) Беларусі тав. Панамарэнкі П.К. // Бальшавік Беларусі. – 1945. – № 1–2. – С. 35–37.
3. Горбунов, Т. Белорусская культура живет и развивается / Т. Горбунов // Славяне. – 1945. – № 1. – С. 30–32.
4. Панамарэнка, П.К. Аднаўленне прамысловасці, энергетыкі і жыллёва-камунальнай гаспадаркі ў вызваленых раёнах / П.К. Панамарэнка // Беларусь. – 1944. – № 3. – С. 9–10.
5. Вознесенский, Н.А. Военная экономика СССР в период Великой Отечественной войны / Н.А. Вознесенский. – М., 1947.
6. Кравченко, И.С. Белорусский народ в годы Великой Отечественной войны / И.С. Кравченко, А. И. Залесский. – Минск: Госиздат БССР, 1959. – 146 с.
7. Очерки истории Коммунистической партии Белоруссии : в 2 ч. / Ин-т ист. партии при ЦК КПБ. – Ч. 2 : 1921–1966 ; редкол.: С. А. Пилотович (предс.) [и др.]. – Минск: Беларусь, 1967. – 588 с. – С.387–402.
8. Марченко, И. Вклад рабочих в общенародное дело: восстановление народного хозяйства. 1943–1945 гг. / И. Марченко // Блокнот агитатора. – 1959. – № 17. – С. 11–17.
9. Михайловский, Л.А. Первые восстановительные работы в Минске после освобождения его от немецко-фашистских захватчиков. Июль 1944 – май 1945 гг. / Л.А. Михайловский // Вопросы истории БССР. – 1969. – Вып. 37. – С. 179–194.
10. Пейсахович, А. Культурное строительство в Белорусской ССР в 1943–1945 гг. / А. Пейсахович. – Минск: изд-во БГУ, 1961. – 67 с.
11. Марченко, И.Е. Трудовой подвиг рабочего класса Белорусской ССР / И.Е. Марченко. – Минск: Наука и техника, 1977. – 248 с.
12. Белязо, А.П. Беларуская вёска ў пасляваенныя гады / А.П. Белязо. – Мінск: Выд-ва БДУ. – 1974. – 176 с.
13. Галузо, А. Так спасали книги / А. Галузо // Неман. – 1975. – № 7. – С. 188–189.
14. Смиловицкий, Л.Л. Открывались техникумы / Л.Л. Смиловицкий // Сельское хозяйство Белоруссии. – 1984. – № 5. – С. 29.
15. Олехнович, Г.И. Экономика Белоруссии в условиях Великой Отечественной войны (1941–1945) / Г.И. Олехнович. – Минск: БГУ, 1982. – 174 с.
16. Купреева, А.П. Возрождение народного хозяйства Белоруссии (1942–1945 гг.); научн. ред. П.Т. Петриков / П.П. Купреева. – Минск: Наука и техника, 1976. – 223 с.
17. Купреева, А.П. Народы СССР – трудящимся Белоруссии: Возрождение хоз.-эконом.жизни республики в 1943–1945 гг.; научн. ред. П.Т. Петриков. – Минск: Наука и техника, 1981. – 208 с.
18. Иоффе, Э. Дружба народов СССР – один из источников победы над германским нацизмом : (по материалам партиз. движения в Беларуси в 1941–1944 гг.) / Э. Иоффе // Гісторыя: праблемы выкладання. – 2005. – № 2. – С. 3–6.
19. Канапацкі, І.Б. Дапамога беларускаму народу ў аднаўленні гаспадаркі Беларусі. 1943–1945 гг. / І.Б. Канапацкі, Л.Л. Шкуцько, Г.А. Шкуцько // Новая и Новейшая история Европы и США: проблемы, поиски, исследования : сборник научных статей / Министерство образования Республики Беларусь, Белоруский государственный педагогический университет им. М. Танка. – Минск, 2006. – С. 81–85.
20. Кузьменко, В.И. В суровые сороковые: интеллигенция Беларуси в Великой Отечественной войне (1941–1945 гг.) / В.И. Кузьменко. – Минск: ГНУ “Институт истории НАН Беларуси”, 2006. – 260 с.
21. Кузьменко, В. Брестская область в послеоккупационный военный период : Авг. 1944 – май 1945 г. : (По материалам обл. органов партийн.-гос. власти) / В. Кузьменко // Архівы і справаводства. – 2004. – № 3. – С. 106–109.

22. Беларусь в годы Великой Отечественной войны. 1941–1945 гг. / А.А. Коваленя (руководитель авторского коллектива), А.М. Литвин, В.И. Кузьменко [и др.] – Минск: Белта, 2005. – 544 с.
23. Хохлов, А.В. Проблема восстановления народного хозяйства в годы Великой Отечественной войны: историографический аспект / А.В. Хохлов // Вестник Самарского государственного университета. – 2007. – № 5. – С. 244–255.
24. Кузьменко, В.И. В суровые сороковые: интеллигенция Беларуси в Великой Отечественной войне (1941–1945 гг.) / В.И. Кузьменко. – Милски ГНУ "Институт истории НАН Беларуси", 2006. – 260 с.
25. Возвращенные имена. Сотрудники АН Беларуси, пострадавшие в период сталинских репрессий /сост. и авт. предисл. Н.В. Токарев; под ред. А.С. Мохнача. – Мінск: Навука і тэхніка, 1992. – 120 с.
26. Шарков, А.В. Военнопленные и интернированные на территории Беларуси: роль органов внутренних дел в их содержании и трудовом использовании (1944–1951 гг.); под ред. В.П. Павлова. Монография / А.В. Шарков. – Минск: Академия МВД Республики Беларусь, 1977. – 159 с.
27. Шарков, А.В. Архипелаг ГУПВИ: военнопленные и интернированные на территории Беларуси: 1941–1951 гг. / А.В. Шарков. – Минск: Тессей, 2003. – 168 с.
28. Мишуровская, О.Е. Проблема итальянских военнопленных Второй мировой войны в белорусско-итальянских отношениях / О.Е. Мишуровская // Веснік Бел. дзярж. ун-та. Сер. 3, Гісторыя, філасофія, псіхалогія, паліталогія, сацыялогія, эканоміка, права. – 2005. – № 2. – С. 33–36.
29. Самович, А.Л. Отечественная история военного плена: некоторые итоги изучения проблемы / А.Л. Самович // Вести института современных знаний. – 2007. – № 3. – С. 24–27.
30. Белозорович, В.А. Аграрные преобразования в западных областях Беларуси в 1939–1952 годах : автореф. … дис. канд. ист. наук : 07.00.02 / В. А. Белозорович ; Белорус. гос. пед. ун-т. – Минск, 1999. – 15 с.
31. Валаханович, И.А. Антисоветское подполье на территории Беларуси в 1944–1953 гг. / И.А. Валаханович. – Минск: БГУ, 2002. – 146 с.
32. Ермолович, В.И. Огнем и мечом : Хроника польского националистического подполья в Белоруссии (1939–1953 гг.) / В.И. Ермолович, С.В. Жумарь. – Минск: БелНИЦДААД, 1994. – 112 с.
33. Рыбак, Н.А. Деятельность Армии Крайовой и постаковских формирований в Западной Беларуси в 1944–1945 гг. : автореф. … дис. канд. ист. наук : 07.00.02 / Н.А. Рыбак ; Белорус. гос. пед. ун-т. – Минск, 2001. – 20 с.
34. Ситкевич, С.А. Деятельность польского подполья на территории Беларуси (1939–1954 гг.). Историография проблемы : автореф. … дис. канд. ист. наук : 07.00.09 / С.А. Ситкевич ; Ин-т истории НАН Беларуси. – Минск, 2002. – 20 с.
35. Раманько, О.В. Коричневые тени в Полесье: Белоруссия 1941–1945 / О.В. Романько. – М.: Вече, 2008. – 432 с.
36. Черняк, Ю.В. Деятельность украинских организаций и их вооруженных формирований на территории Западной Беларуси в годы Великой Отечественной войны; автореф. … дис. канд. ист. наук: 07.00.02; Ю.В. Черняк; Белорус. гос. пед ун-т,. – Минск, 2007. – 20 с.
37. Силова, С.В. Православная церковь в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (1941–1945 гг.) : моногр. / С.В. Силова. – Гродно: ГрГУ, 2003. – 105 с.
38. Ярмусик, Э.С. Католический костел в Белоруссии в годы Второй мировой войны (1939–1945) : моногр. / Э.С. Ярмусик. – Гродно: ГрГУ, 2002. – 240 с.